www.gazeta.bsu.by

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

28 студзеня 2005 года, № 2 (1910)

СВЯТЫ

## ТАЦЦЯНІН ДЗЕНЬ

*Афіцыйна Дзень студэнта ў Беларусі святкуюць 17 лістапада. Аднак ёсць і яшчэ адзін дзень у годзе, калі беларускае студэнцтва адзначае сваё свята — неафіцыйна, салідарна з расійскімі студэнтамі. Гэта Таццянін дзень, 25 студзеня.*

Называецца ён у гонар святой Таццяны — адзінай дачкі знатнага рымляніна, які быў патаемным хрысціянінам і выхаваў сваю дачку ў той самай веры. Дасягнуўшы паўналецця, Таццяна адмовілася ад шлюбу і вырашыла цалкам прысвяціць сябе царкве. На той час Рымам кіраваў 16-гадовы Аляксандр Север, аднак рэальная ўлада была ў руках фанатычнага прыгнятальніка хрысціян Ульпіяна. За хрысціянскую дзейнасць Таццяну і яе бацьку схапілі і забілі. Адбылося гэта акурат 25 студзеня 226 года ад Нараджэння Хрыстова.

Па-грэчаску імя "Таццяна" азначае "заснавальніца". Менавіта ў Таццянін дзень у 1775 годзе імператрыца Лізавета Пятроўна падпісала ўказ пра адкрыццё ў Маскве першага расійскага універсітэта. Святая Таццяна стала яго нябёснай заступніцай.

Нямногія студэнты сёння ведаюць пра паходжанне свята і пра тое, што яно — расійскае. І ў Беларусі яно адзначаецца вельмі шырока. У студэнцкіх інтэрнатах адбываюцца дыскатэкі. Усе Тані атрымліваюць багата віншаванняў і падарункаў. Дарэчы, у гэты дзень Таццян прынята асыпаць не толькі падарункамі, але і снегам. Звычай такі.

Калі на Таццянін дзень выпадае экзамен, студэнты радуюцца: выкладчыкі ставяцца да іх больш мякка, не жадаюць псаваць свята. А Таццяны ў гэты дзень здаюць іспыты проста выдатна.

*Юлія ПАПОВА, фота аўтара*







*На фотаздымках — студэнткі Таццяны*

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

**Вынікі візіту ў Польшчу** с. 2

*Пагадненне пра супрацоўніцтва паміж БДУ і Варшаўскім універсітэтам тэрмінам на 6 гадоў падпісана ў сталіцы Польшчы падчас візіту ў гэтую краіну дэлегацыі БДУ на чале з рэктарам прафесарам Васілём Іванавічам Стражавым.*

**Куратар, які захапляе і захапляецца** с. 3

*Інтэрв'ю з адным з найлепшых куратараў мінулага года Андрэем Эдуардавічам Караньковым.*

**Трэба праца — мы дапаможам!** с. 3

*Вось ужо 5 гадоў пад эгідай БРСМ у нашым універсітэце працуе Студэнцкі цэнтр занятасці.*

### Чытайце нас у Інтэрнэце

***Газета «Беларускі універсітэт» мае свой сайт (www.gazeta.bsu.by). Вы можаце даведвацца пра новыя матэрыялы яшчэ да таго, як выйдзе свежы нумар выдання. Акрамя таго, на сайце вы знойдзеце больш поўныя версіі матэрыялаў газеты.***

ВІНШУЕМ!

## З ДНЁМ НАРАДЖЭННЯ, ЛІЦЭЙ!

Ліцэй БДУ заўжды быў выключэннем з правілаў — незалежна ад таго, датычылася гэта навучання ці баўлення вольнага часу. Вось і свой дзень нараджэння гэтая ўстанова святкуе на адзін (як усе іншыя), а цэлыя тры дні — з 3 па 5 лютага. Праўда, гэта не значыць, што на працягу трох дзён навучэнцы будуць адпачываць. Мяркуйце самі. На 3 лютага прызначаныя навукова-практычная канферэнцыя, канцэрт і дыскатэка для ліцэістаў. 4 лютага адбудуцца спартыўнае свята, урачыстае пасяджэнне, прысвечанае 15-годдзю ліцэя, і канцэрт. А 5 лютага — вечар-сустрэча выпускнікоў.

У добры шлях, ліцэй!

*Марыя КАВАЛЁВА*

ЮБІЛЕІ

## АКАДЭМІКУ Ф.М. КАПУЦКАМУ — 75

Урачыстае пасяджэнне Вучонага савета нашага універсітэта 10 студзеня прысвячалася акадэміку Фёдару Мікалаевічу Капуцкаму. У яго супалі дзве знамянальныя даты — 75-гадовы юбілей і 50-годдзе навуковай і педагагічнай дзейнасці. Юбіляра цёпла павіншавалі старшыня Прэзідыума НАН Беларусі Міхаіл Уладзіміравіч Мясніковіч, міністр адукацыі Аляксандр Міхайлавіч Радзькоў, старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Анатоль Іванавіч Лесніковіч, а таксама кіраўнікі канцэрна «Белбіяфарм», рэктары сталічных ВНУ, калегі з Расійскай акадэміі навук. З дакладам выступіў першы прарэктар БДУ Сяргей Кімавіч Рахманаў. Быў таксама прадэманстраваны відэафільм пра жыццё і дзейнасць Ф.М. Капуцкага.

Сёння акадэмік Ф.М. Капуцкі загадвае аддзелам хіміі поліцукрыдаў НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ. Ён Заслужаны работнік вышэйшай школы, доктар хімічных навук, прафесар. З 16 красавіка 1990 па 30 снежня 1990 г. Фёдар Мікалаевіч быў рэктарам нашага універсітэта. Мае ўзнагароды: ордэн «Знак Пашаны», медаль Францішка Скарыны, дзве Ганаровыя граматы Вярхоўнага Савета БССР, Ганаровую грамату Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Ганаровую грамату Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

### НАПІШАМ ЛЕТАПІС ALMA MATER РАЗАМ!

*Шаноўныя чытачы!*

*На вашым факультэце адбываецца штосьці цікавае? У вас прайшлі конкурсы і вечарыны? Пішыце ў "Беларускі універсітэт" — і ўвесь БДУ будзе ведаць пра вас.*

*Якія тэмы, пытанні, праблемы павінны, на вашу думку, уздымацца на старонках нашай газеты?*

*Свае прапановы вы можаце даслаць у рэдакцыю па электроннай пошце (**gazeta@bsu.by**), альбо патэлефанаваць нам **(209-53-45)**.*

СУПРАЦОЎНІЦТВА

## ПАДАРУНАК ДА 250-ГОДДЗЯ МДУ

Дэлегацыя Беларускага дзяржаўнага універсітэта на чале з рэктарам прафесарам Васілём Іванавічам Стражавым прыняла ўдзел у юбілейных святкаваннях з нагоды 250-годдзя заснавання Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя М.В. Ламаносава, якія пачаліся 24 студзеня. 25 студзеня, калі галоўнай расійскай ВНУ споўнілася 250 гадоў, у Дзяржаўным Крамлёўскім палацы адбыўся ўрачысты сход.

Ва ўрачыстасцях прынялі ўдзел кіраўнікі Расіі, Масквы і рэгіёнаў краіны, прадстаўнікі Расійскай акадэміі навук, Расійскага саюза рэктараў, міжнародных арганізацый і асацыяцый універсітэтаў, ганаровыя замежныя госці, выдатныя навукоўцы і грамадскія дзеячы.

Дэлегацыя БДУ падрыхтавала расійскім калегам унікальны падарунак, які не мае аналагаў ні ў адным універсітэце СНД і Еўропы, — універсальны лабараторны комплекс па ядзернай фізіцы. Ён распрацаваны ў нашым універсітэце і дазваляе на сучасным узроўні праводзіць лабараторныя работы па асноўных раздзелах ядзернай фізікі. Студэнты могуць вывучаць працэсы ўзаемадзеяння выпраменьвання з рэчывам, прынцыпы працы дэтэктараў выпраменьвання і формы спектраў выпраменьвання

ПАДЗЕІ

# ВЫНІКІ ВІЗІТУ Ў ПОЛЬШЧУ

*Пагадненне пра супрацоўніцтва паміж Беларускім дзяржаўным універсітэтам і Варшаўскім універсітэтам тэрмінам на 6 гадоў падпісана ў сталіцы Польшчы падчас візіту ў гэтую краіну дэлегацыі БДУ на чале з рэктарам прафесарам* ***Васілём Іванавічам СТРАЖАВЫМ.***

Гэты дакумент прадугледжвае разнастайныя формы двухбаковага ўзаемадзеяння, у тым ліку абмен студэнтамі, магістрантамі, аспірантамі, дактарантамі для навучання, стажыроўкі і вучэбнай практыкі; запрашэнне прадстаўнікоў прафесарска-выкладчыцкага саставу для чытання лекцый і правядзення практычных заняткаў, абмену вопытам і інфармацыяй па навучальна-метадычнай рабоце, навучальных планах і праграмах; арганізацыя сумесных навуковых даследаванняў, канферэнцый, семінараў і іншых навуковых мерапрыемстваў, публікацыя навуковых, навучальных і метадычных матэрыялаў па выніках правядзення сумесных работ; абмен навукова-тэхнічнай і навучальна-метадычнай літаратурай, а таксама перыядычнымі выданнямі; абмен вопытам у пытаннях унутранага кіравання і міжнароднай дзейнасці вышэйшых навучальных устаноў.

У рамках афіцыйнага візіту ў Варшаву адбыліся таксама двухбаковыя перагаворы ў міністэрствах адукацыі і спорту, навукі і інфармацыі Польшчы, падчас якіх абмяркоўваліся перспектывы плённага супрацоўніцтва ў сферы вышэйшай адукацыі і ў рэалізацыі сумесных навуковых праектаў. Дэлегацыя БДУ азнаёмілася з працай кафедры беларусістыкі Варшаўскага універсітэта і сустрэлася са студэнтамі, якія вывучаюць беларускую мову.

Прарэктар БДУ па міжнародных сувязях Уладзімір Аркадзьевіч Астапенка падкрэсліў, што гэта быў першы ў гісторыі супрацоўніцтва універсітэтаў візіт на ўзроўні рэктара, што сведчыць аб важнасці, якую надаюць абодва бакі такому ўзаемадзеянню.

Акрамя таго, падпісаная дамова адкрывае новыя дадатковыя магчымасці для арганізацыі супрацоўніцтва паміж навучальнымі ўстановамі. А дэталі і канкрэтныя формы ў працоўным парадку будуць удакладняцца з калегамі з Варшаўскага універсітэта. Плануецца, што на працягу 2—3 месяцаў будзе падрыхтавана рабочая праграма, у склад якой увойдуць спецыяльныя дамоўленасці, канкрэтныя лічбы абмену студэнтамі, вызначацца навуковыя тэмы, якія будуць распрацоўвацца сумесна, міжнародныя мерапрыемствы, у якіх мы будзем удзельнічаць. Дарэчы, усе зацікаўленыя структуры універсітэта, як зазначыў У.А. Астапенка, могуць накіроўваць свае прапановы па супрацоўніцтве з Варшаўскім універсітэтам ва ўпраўленне па міжнародных сувязях.

*Усе зацікаўленыя структуры універсітэта могуць накіроўваць свае прапановы па супрацоўніцтве з Варшаўскім універсітэтам ва ўпраўленне па міжнародных сувязях.*

Ёсць папярэдняя дамоўленасць пра тое, што ў маі гэтага года да нас з візітам у адказ прыедзе рэктар Варшаўскага універсітэта прафесар П. Вянгленскі. Падчас гэтай сустрэчы плануецца падпісаць канкрэтную рабочую праграму супрацоўніцтва, дзе будзе прадстаўлена схема ўзаемадзеяння на працягу 6 гадоў. Адным з прыярытэтных накірункаў з боку БДУ будзе падтрымка беларусістыкі ў сценах Варшаўскага універсітэта. Цяпер каля 150 студэнтаў вывучаюць там беларускую мову. Ёсць адпаведная кафедра, выкладчыкі, што цікавяцца падручнікамі, матэрыяламі, якія выкарыстоўваюцца ў навучанні ў нашым універсітэце. Тут, на думку У.А. Астапенкі, ёсць вялікі патэнцыял для супрацоўніцтва ў філолагаў нашага універсітэта, якія могуць падзяліцца вопытам з варшаўскімі калегамі. Студэнты-беларусісты з Варшаўскага універсітэта маглі б наведаць Беларусь. З іншага боку, гэта дае і нам магчымасць развіваць паланістыку. Усе, хто цікавіцца польскай мовай, гісторыяй суседняй краіны, маглі б наведаць Польшчу для правядзення навуковых даследаванняў.

Візіт у Варшаву таксама даў магчымасць удакладніць сумесныя намаганні ў галіне развіцця міжнароднай праграмы гуманітарных даследаванняў, якая ўжо працуе на асобных гуманітарных факультэтах БДУ. Чакаецца, што ў межах гэтай праграмы ўжо з наступнага года будуць адкрыты дадатковыя магчымасці для аспірантаў, якія змогуць спалучаць навучанне ў аспірантуры БДУ і польскіх ВНУ з магчымасцю паралельнага кіраўніцтва навуковымі працамі.

Праграма візіту ўключала і наведванне Вышэйшай гуманітарнай школы імя Аляксандра Гейштара ў Пултуску, якая займае першае месца ў рэйтынгу сярод 300 нядзяржаўных навучальных устаноў Польшчы. У Пултуску таксама адбылася прэзентацыя беларуска-польскага зборніка «Чалавек. Экалогія. Культура», у які ўвайшлі артыкулы беларускіх і польскіх студэнтаў. Гэта вынік сумеснай летняй школы, якая была арганізавана ўпершыню паміж Мінскам і Пултускам.

Акрамя таго, была дасягнута дамоўленасць на ўзроўні рэктараў, што ў красавіку гэтага года БДУ накіруе ў Пултуск групу студэнтаў, якія разам са студэнтамі з Вышэйшай гуманітарнай школы будуць працаваць на могілках савецкіх воінаў, дзе пахавана каля 16 тысяч чалавек, што загінулі падчас II Сусветнай вайны, вызваляючы Пултуск. Там ёсць мемарыял, які неабходна прывесці ў належны стан. Гэтая акцыя будзе прысвечана 60-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

*Таццяна КАЗАК*

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# ПРАФЕСІЯНАЛ ПАВІНЕН БЫЦЬ МАРАЛЬНЫМ



*Пры стварэнні Камісіі па этыцы ёй быў нададзены высокі статус. Паводле палажэння, старшыня Камісіі па этыцы з'яўляецца намеснікам старшыні Аб'яднанага савета БДУ. Сваім загадам ад 29 снежня 2004 года № 42 рэктар БДУ Васіль Іванавіч Стражаў падкрэсліў значнасць гэтай Камісіі. Ёй пастаўлена ў абавязак павысіць патрабавальнасць да захавання нормаў прафесійнай этыкі прафесарска-выкладчыцкім саставам, навуковымі супрацоўнікамі. З гэтай нагоды мы гутарым з яе старшынёй, загадчыкам кафедры тэарэтычнай механікі і робататэхнікі, дацэнтам* ***Мікалаем Іванавічам КАЗЛОЎСКІМ.***

**— Якім чынам Вы збіраецеся выкоўваць гэтае распараджэнне?**

— Камісіяй па этыцы па даручэнні Вучонага савета БДУ распрацаваны праект Кодэксу прафесійнай этыкі выкладчыка Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Кодэкс будзе садзейнічаць і эфектыўнаму выкананню загада рэктара.

Гэты невялікі дакумент уяўляе сабой звод правілаў, якія вызначаюць патрабаванні да асобы выкладчыка і яго паводзінаў у працэсе прафесійнай дзейнасці. Кодэкс распрацоўваўся пры актыўным удзеле ўсіх членаў Камісіі. Быў апрацаваны вялікі аб'ём матэрыялу па кодэксах прафесійнай этыкі розных катэгорый работнікаў. (Такія кодэксы ёсць у адвакатаў, псіхіятраў, дзяржслужачых Расійскай Федэрацыі, мытнікаў, афіцэраў Узброеных Сілаў Рэспублікі Беларусь.) Патрабаванні і нормы, закладзеныя ў нашым Кодэксе прафесійнай этыкі, дазваляюць бачыць у выкладчыку не толькі прафесіянала, але добразычліва старэйшага таварыша для студэнтаў, які з'яўляецца ўзорам паводзінаў для іншых на працы і ў побыце.

Калі гэты праект будзе зацверджаны, ён пачне дзейнічаць як нарматыўны дакумент для атэстацыйных камісій пры атэстацыі кіраўнікоў, прафесарска-выкладчыцкага саставу, навуковых і педагагічных супрацоўнікаў.

**—Ці часта Камісіі па этыцы даводзілася вырашаць спрэчныя пытанні?**

— Паколькі мы працуем па заявах, то не так ужо і часта. Разабралі ўсяго каля 10 зваротаў, што гаворыць пра здаровы маральна-псіхалагічны клімат у вялікім калектыве універсітэта. У прыватнасці, адна з буйных спраў, па якой мы працавалі каля года, — канфлікт на фізічным факультэце. Зразумела, калі чалавек звяртаецца, ён просіць аб абароне сваіх інтарэсаў, аднак мы павінны адносіцца да сітуацыі аб'ектыўна і меркаваць, зыходзячы з пазіцый справядлівасці. Што датычыць гэтай справы, то звальненне супрацоўніка было законным. Ён, праўда, не задаволіўся рашэннем нашай Камісіі і арганізаваў чатыры судовыя працэсы, якія універсітэт выйграў.

Тут я хачу зазначыць, што Камісія па этыцы дае не юрыдычную ацэнку дзеянням, а толькі маральную. (Хаця ў складзе Камісіі — тры юрысты.) Мы не працуем па пытаннях, звязаных з працоўным заканадаўствам і калектыўнымі дагаворамі. Іх рашэнне ва універсітэце даручана камісіі па працоўных спрэчках прафкама. Не разглядаем мы таксама і шлюбна-сямейныя адносіны, жыллёвыя і іншыя, якія рэгулююцца нормамі юрыдычных кодэксаў.

**— Я ведаю, што да Вас прыходзяць і пісьмы са скаргамі без подпісаў...**

— Ёсць супрацоўнікі, якія пішуць скаргі на незадаволенасць чымсьці адразу ва ўсе інстанцыі аднachасова: рэктару, у Міністэрства адукацыі, у Камісію па этыцы. Па-першае, хочам папярэдзіць, што наша Камісія прыступае да аналізу сітуацыі толькі пасля таго, як адбылося адміністрацыйнае рашэнне. У Камісію па этыцы трэба ісці толькі пасля таго, як ты не задаволены адміністрацыйным рашэннем. Мы можам даваць ацэнку толькі таму, у якой форме было вынесена адміністрацыйнае спагнанне — у крыўднай для заяўніка ці не, ці адпавядае гэта маральным нормам. Прычым наша рашэнне заўсёды носіць рэкамендацыйны характар. Па-другое, Камісія наогул не разглядае скаргаў без подпісу.

**— Некаторыя людзі баяцца, што іх скаргі будуць абнародаваны...**

— Згодна з палажэннем, Камісія самастойна прымае рашэнні аб канкрэтных формах ацэнкі і сродках абнародавання. У выпадках, калі сітуацыя ўяўляе грамадскі інтарэс, то яна можа быць абнародавана, аднак калі пытанне прыватнае, то абнародаванне было б залішнім. Вядома, улічваецца пры гэтым і жаданне заяўніка.

*Ганна ЛАГУН*

*Фотаздымак Юліі ПАПОВАЙ*

***Тэлефон Камісіі па этыцы: 209-54-25 (Багданава Ларыса Міхайлаўна)***

АФІЦЫЙНА

# НОВЫ ВУЧОНЫ САКРАТАР

*На пасяджэнні Вучонага савета БДУ 21 студзеня гэтага года быў абраны новы вучоны сакратар Вучонага савета. Ім стаў* ***Міхаіл Анатольевіч ЖУРАЎКОЎ.***

Нарадзіўся 19 лістапада 1961 г. у Салігорску. Доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, загадчык кафедры тэарэтычнай і прыкладной механікі механіка-матэматычнага факультэта.

У 1984 г. скончыў механіка-матэматычны факультэт БДУ па спецыяльнасці "механіка". Пасля заканчэння завочнай аспірантуры пры БДУ ў 1987 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю на саісканне навуковай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук па спецыяльнасці "Механіка дэфармуемага цвёрдага цела". У 1993 г. абараніў доктарскую дысертацыю, у студзені 1994 г. яму была нададзена навуковая ступень доктара фізіка-матэматычных навук.

Мае больш за 300 навуковых прац, з іх 10 манаграфій. Падрыхтаваў 6 кандыдатаў навук і 1 доктара навук.

## СПРАВАЗДАЧА ФАКУЛЬТЭТА МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН

21 студзеня адбылося пашыранае пасяджэнне рэктарата, на якім абмяркоўвалася вучэбная, выхаваўчая і навукова-даследчая работа на факультэце міжнародных адносін БДУ. З дакладам выступіла намесніца дэкана факультэта Людміла Міхайлаўна Хухлындзіна.

Факультэт міжнародных адносін — адзін з самых маладых у БДУ. Ён створаны 1 кастрычніка 1995 года і ў гэтым годзе будзе святкаваць сваё 10-годдзе. Аднак нягледзячы на невялікі ўзрост факультэт ужо дасягнуў значных поспехаў. Цяпер тут навучаецца 2020 студэнтаў па 8 спецыяльнасцях.

Адна з хвалюючых праблем факультэта, па словах Людмілы Міхайлаўны, — матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне. Сярод асноўных перспектыўных накірункаў развіцця — пашырэнне магістэрскай падрыхтоўкі.

Нагадаем, што справаздача факультэта міжнародных адносін размешчана ў электронным выглядзе на ўнутраным серверы БДУ (**intranet.bsu**). Там таксама можна пазнаёміцца са справаздачамі біялагічнага, геаграфічнага і эканамічнага факультэтаў БДУ.

Наступнае пасяджэнне рэктарата мяркуецца прысвяціць філалагічнаму факультэту.

*Таццяна КУХАРЧУК*

## ВІНШУЕМ!

*На пасяджэнні Вучонага савета БДУ па выніках конкурсу на вакантныя пасады, абвешчанага праз газету "Беларускі універсітэт", былі зацверджаны:*

Анатоль Міхайлавіч Мінько, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар — на пасаду загадчыка кафедры фізічнай оптыкі;

Аляксандр Мікалаевіч Сізанаў, кандыдат псіхалагічных навук, дацэнт — на пасаду загадчыка кафедры псіхалогіі і педагогікі дзяржаўнай установы адукацыі "Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы БДУ";

Віктар Антонавіч Каляда, доктар педагагічных навук, прафесар — на пасаду прафесара кафедры фізвыхавання і спорту;

Валянцін Аляксандравіч Сяткоўскі, доктар медыцынскіх навук, старшы навуковы супрацоўнік — на пасаду прафесара кафедры рэабіліталогіі ўстановы адукацыі "Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ".

*Вучоным саветам БДУ да зацверджання вучоных званняў былі рэкамендаваны:*

доктар фізіка-матэматычных навук Уладзімір Міхайлавіч Котаў — вучонае званне прафесара па спецыяльнасці матэматыка;

доктар філасофскіх навук Леў Яўстаф'евіч Крышталовіч — вучонае званне прафесара па спецыяльнасці паліталогія;

доктар філалагічных навук Аляксандр Мікалаевіч Гардзей — вучонае званне дацэнта па спецыяльнасці мовазнаўства;

кандыдат фізіка-матэматычных навук Анжаліка Іванаўна Краўчук — вучонае званне дацэнта па спецыяльнасці матэматыка;

кандыдат юрыдычных навук Вікторыя Яўгенаўна Лізгара — вучонае званне дацэнта па спецыяльнасці права;

кандыдат юрыдычных навук Наталля Адамаўна Шынгель — вучонае званне дацэнта па спецыяльнасці права.

АСОБЫ

# КУРАТАР, ЯКІ ЗАХАПЛЯЕ І ЗАХАПЛЯЕЦЦА

*На біялагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта **Андрэй Эдуардавіч КАРАНЬКОЎ** з'явіўся тры гады таму. Для гэтага яму прыйшлося пераехаць з Салігорска і пакінуць школу № 12, якая стала вядомай, калі ў ёй упершыню ў рэспубліцы праводзіўся экалагічны лагер для дзяцей. І ўсё дзякуючы Андрэю Эдуардавічу. Разам з жонкай яшчэ ў школе ён распрацаваў новую экалагічную алімпіяду. Адкрыў музей насякомых. Не сказаць, што універсітэт для яго нешта незнаёмае — сам закончыў біялагічны факультэт. І сёння ўжо ў якасці выкладчыка вярнуўся ў яго сцены. Са студэнтамі яму прыходзіцца сустракацца на лабараторна-практычных занятках. А паколькі ён чалавек даволі актыўны і неабыякавы да многіх рэчаў, то не супраць наладзіць з імі і больш цесныя кантакты. У гэтым яму дапамагае пасада куратара. На конкурсе "Куратар года БДУ" (2003—2004 гады), які праводзіла ўпраўленне выхаваўчай работы з моладдзю БДУ, ён заняў другое месца. З гэтай нагоды мы з ім і сустрэліся.*

**— Вы працавалі ў школе, сёння — ва універсітэце. Наколькі кардынальна, на Вашу думку, адрозніваюцца студэнты ад школьнікаў?**

— Студэнты больш самастойныя, чым школьнікі, і ім меней патрэбна кіраўніцтва да дзеянняў. Гэта людзі, якія часта адмаўляюцца наогул ад усякай дапамогі, таму што стаміліся ад таго, што іх увесь час нехта кудысьці вядзе: напрыклад, у школе — гэта класны кіраўнік, завуч і г. д. Прыходзячы ў вышэйшую навучальную ўстанову, яны нават спачатку губляюцца, бо тут няма такога пастаяннага кантролю, які б вісеў над імі. У першыя тры месяцы адбываецца адаптацыя да новых умоў вучобы. Ёсць тыя, хто хутка адаптуецца на новым месцы, а ёсць і такія, каму патрэбна дапамога. У апошнім выпадку гэта часцяком выдатнікі, нават пераможцы разнастайных інтэлектуальных алімпіяд, якія прывыклі да апекі і ўвагі да іх з боку настаўнікаў і класных кіраўнікоў. У школе ім усе дапамагалі, у ВНУ яны аказваюцца як бы кінутымі. Якраз ім і неабходна псіхалагічная дапамога і ўдзел, каб яны адчулі, што і ва універсітэце не адзінокія.

Куратар патрэбен асабліва на першых курсах, калі студэнты вучацца арыентавацца ва універсітэцкім жыцці, калі ім патрэбна новая інфармацыя пра навучальны працэс, кафедры і настаўнікаў. Ва ўсіх астатніх выпадках пасады куратараў маглі б замяніць сацыяльныя педагогі і іншыя выхавальнікі. Куратар — гэта павадыр, і на мой погляд, духоўны павадыр.

**— Вы ўпэўнены, што ў гэтым выпадку будзе да месца азначэнне "духоўны"?**

— Калі мы маем найбольш праблем? Тады, калі не знаходзім простага чалавечага разумення і спачування, калі няма побач чалавека, з якім можна падзяліцца сваімі перажываннямі. Чаму некаторыя з нас не з кніжак ведаюць, што такое суіцыдальны сіндром? Ды таму, што не адчуваюць удзелу ў сваім жыцці іншых людзей. Часта студэнт не можа падзяліцца набалелым нават са сваімі бацькамі, бо паміж імі сварка або неразуменне. Бывае прасцей прыйсці да няроднага чалавека, блізкага табе па духу. Я шмат ведаю пра асабістае жыццё сваіх студэнтаў, бо яны могуць прыйсці да мяне і паразмаўляць. І, магчыма, ім ад гэтага становіцца лягчэй. Зразумела, для таго, каб студэнт прыйшоў да выкладчыка са сваімі асабістымі перажываннямі, трэба заслужыць давер. І вам, канешне, не будуць давяраць, калі вы падвялі чалавека хоць бы адзін раз. Я стараюся выконваць свае абяцанні. А калі не атрымоўваецца дапамагчы, то не саромеюся патэлефанаваць і папрасіць прабачэння нават тады, калі на провадзе хтосьці маладзейшы за цябе ў два разы.

**— Я ведаю, што як куратар Вы сярод сваіх падапечных часта праводзіце анкетаванне. Ці можна даведацца з якой мэтай? І хто складае пытанні анкет?**

— Гэта работа праводзіцца толькі для сябе. Каб лепей пазнаёміцца са студэнтамі. Яно'і зразумела, калі чалавек для вас незнаёмы, то вельмі складана адразу загаварыць з ім пра сур'ёзныя рэчы. Вам прыемна гутарыць з чалавекам толькі таму, што ён падзяляе некаторыя вашыя думкі. Дык вось для таго, каб куратар і студэнт пачалі больш разумець адзін аднаго, нярблага б было спачатку пазнаёміцца.

Анкетаванне я праводжу на самыя розныя тэмы: і міжасабовыя адносіны, і любоў студэнтаў да пэўных прадметаў, выкладчыкаў, нават нашай краіны. Анкеты я аналізую і выводжу працэнты. Атрымліваецца вельмі цікавая інфармацыя. Напрыклад, шляхам анкетавання я даведаўся, на колькі працэнтаў кожны студэнт з'яўляецца лідэрам у сваёй групе. У анкетах студэнты мне адказваюць, на колькі груповак дзеліцца іх калектыў і хто там лічыцца лідэрам. Бясспрэчна, што не абапірацца ў сваёй рабоце куратара на лідэраў — як фармальных, так і нефармальных — не мела б сэнсу.



З дапамогай анкет лягчэй выявіць інтарэсы сваіх студэнтаў. А потым працаваць на іх інтарэсы. У такім разе куратару застаецца толькі "закідваць" у іх асяроддзе ідэі, якія там перапрацоўваюцца і рэалізоўваюцца. Можна, канешне, навязваць, напрыклад, тыя ж мерапрыемствы. Але студэнты, калі гэта ім не цікава, не адрэагуюць на твае прапановы і ўсё адно не будуць у іх удзельнічаць.

**— У такім разе, што цікавіць вашых студэнтаў?**

— Тое, што іх цікавіць на самай справе, — гэта іх спецыяльнасць. Я курырую групу біятэхнолагаў. Пра сумежныя спецыяльнасці біяхімію, генетыку, малекулярную біялогію яны могуць слухаць таксама гадзінамі. Мы дамаўляемся пра сустрэчы з навуковымі супрацоўнікамі, працы якіх друкуюцца ў замежных часопісах, і з іх вуснаў студэнты чуюць аб тым, што цікавіла іх на працягу многіх гадоў яшчэ ў школе. Часта мы арганізоўваем экскурсіі па навуковых лабараторыях і кафедрах нашага універсітэта. Гэта абуджае ў іх душы мары будучага біёлага-даследчыка. Хацелася б, каб ім падабалася вучыцца. І мноства нейкіх іншых мерапрыемстваў у гэтам выпадку, на маю думку, не патрэбны.

**— У Вашай анкеце ёсць пытанне пра гараскопы. Гэта таксама важна ў Вашай рабоце як куратара?**

— Толькі тады, калі з'явілася пытанне аб прыналежнасці студэнтаў да пэўных знакаў задыяка, высветлілася, што лідэрамі, як правіла, становяцца Скарпіёны або Шалі. Ды і потым — гэта адно з пытанняў, цікавае самім студэнтам.

**— Ці можна ў такім разе даведацца, хто Вы самі паводле знаку задыяка і як гэта акалічнасць паўплывала на Ваш характар? Ці адчуваеце Вы сябе лідэрам?**

— Я нарадзіўся на мяжы паміж Казярогам і Вадалеем, што таксама наклала адбітак на маю асобу. Лідэр я ці не лідэр па сваёй сутнасці — могуць сказаць толькі людзі, якія сутыкаюцца са мной у паўсядзённым жыцці. Сам жа я лічу сябе чалавекам захопленым. Колькі сябе памятаю, заўсёды захапляўся адразу некалькімі рэчамі. У студэнцкія гады граў на гітары, ударных музычных інструментах. На працягу многіх гадоў займаўся самба, валейболам, кулявой стральбой, любіў футбол, быў кандыдатам ў майстры па гравым спорце. Апошнім часам мае хобі — энтамалогія. Я збіраю практычна ўсіх насякомых, аднак апошнім часам пераважна матылькоў і жукоў. Біялогія насякомых мяне заўсёды ўражвала сваёй разнастайнасцю. Іх складаныя паводзіны дасюль разгаданыя не поўнасцю. Сярод насякомых ёсць тыя, хто вельмі добра чуе, бачыць, поўзае, плавае і г.д. Куды б я ні ехаў летам, заўсёды бяру з сабой сачок.

**— Гэта не забаўляе навакольных? Дарослы чалавек з сачком у руках можа выклікаць кпіны на свой адрас...**

— Выгляд з сачком здзіўляе навакольных толькі спачатку. Але потым, калі людзі бачаць, наколькі ты шчыры ў сваім захапленні, то пачынаюць дапамагаць табе лавіць гэтых матылькоў і разам с табой адчуваюць азарт паляўнічага. Усе мае знаёмыя, вучні ведаюць, наколькі гэта для мяне важна, і заўсёды — хто з Іспаніі, хто з Італіі — прывозяць мне розных насякомых.

Захапляцца энтамалогіяй я пачаў толькі пасля заканчэння біялагічнага факультэта БДУ, калі вярнуўся на радзіму ў Салігорск выкладаць у школе. Тады мне падалася ўдалай ідэя стварэння музея насякомых. На сённяшні дзень музей насякомых у школе № 12 у Салігорску налічвае каля 1800 відаў, больш за 2000 экзэмпляраў. Мноства розных відаў насякомых трымаю дома ў якасці ўласнай калекцыі. Нават калі толькі адзін раз за некалькі тыдняў я зазірну ў свае каробкі, дзе "адпачываюць на лаўрах" мае матылькі і жукі, мне гэтага хапае, каб атрымаць эмацыянальны зарад, каб жыць і працаваць надалей. Вось для чаго, на мой погляд, і патрэбны захапленні чалавеку. Калі мы любім нечым займацца, у нашым арганізме пачынаюць выпрацоўвацца эндарфіны — гармоны радасці, якія дораць нам новыя сілы і заахвочваюць да дзеянняў.

Захапленні і ёсць тое самае, у чым я знаходжу радасць жыцця. І чым гэтых захапленняў больш, тым больш радуешся.

**— Што б Вы хацелі сказаць сваім студэнтам, якія хутка апынуцца на старэйшых курсах і тым самым вызваляцца з-пад Вашай апекі?**

— Калі робіш тое, што табе не цікава, гэта ніколі не стане тваім захапленнем. Можна многімі рэчамі захапляцца, але нешта адно становіцца пазней для цябе больш важным. Калі мы выбіраем прафесію, то знаходзімся на раздарожжы, бо цяжка адразу ўсвядоміць, што для цябе важна. Я думаю, што вельмі добра, калі менавіта твае прафесійныя інтарэсы прыносяць асалоду. Гэта стымулюе цябе кожны дзень на новыя здзяйсненні.

*Ганна ЛАГУН*

*Фотаздымак Юліі ПАПОВАЙ*

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!



*Вось ужо 5 гадоў пад эгідай БРСМ у нашым універсітэце працуе Студэнцкі цэнтр занятасці, які цяпер узначальвае **Аляксандр ЛЯНКЕВІЧ.***

# ТРЭБА ПРАЦА — МЫ ДАПАМОЖАМ!

Дзейнасць цэнтра ідзе па некалькіх напрамках. Найперш варта адзначыць, што тут студэнтам прапануюць вакансіі: адбор звестак аб працаўладкаванні ідзе з Мінскага гарадскога цэнтра занятасці насельніцтва, з Інтэрнэту, з газет і ад прадстаўнікоў разнастайных прадпрыемстваў і арганізацый. Цэнтр прапануе вакансіі на няпоўны працоўны дзень, з гнуткім графікам працы і такія, што не патрабуюць спецыяльнай адукацыі. Спіс вакансій абнаўляецца прыкладна двойчы за тыдзень.

Акрамя таго двойчы ў год цэнтр занятасці ладзіць "Кірмаш вакансій", у якім бяруць удзел 25—40 прадпрыемстваў і арганізацый. У кірмашы таксама ўдзельнічаюць спецыялісты псіхалагічнай службы студгарадка БДУ, прафкансультанты і юрысты Мінскага гарадскога цэнтра занятасці насельніцтва, якія могуць адказаць на пытанні наведнікаў.

Яшчэ адзін кірунак дзейнасці цэнтра — праграма "Працоўнае лета". У яе рамках могуць атрымаць інфармацыю і пакінуць заяву на ўдзел у летніх сельскагаспадарчых атрадах, педагагічных атрадах для дзіцячых летніх лагераў, працоўных, а таксама валанцёрскіх атрадах.

Кожны тыдзень у Студэнцкі цэнтр занятасці БДУ прыходзіць каля сотні студэнтаў — не толькі з нашага універсітэта, але і з іншых ВНУ: каля 70 % з іх атрымліваюць пастаянную альбо часовую працу на працягу 1—2 тыдняў.

Сёлета ў цэнтр стала звяртацца нашмат больш іншагародніх студэнтаў. 70 % наведнікаў цэнтра — студэнты I—II курсаў. Гэта звязана з тым, што ў гэтым годзе ў БДУ паступіла рэкордная колькасць студэнтаў — не мінчан. Месцаў у інтэрнатах хапіла не ўсім, таму многім даводзіцца здымаць кватэры. Вось і шукаюць яны працу, каб аплаціць жыллё.

У 2003 годзе праект "Студэнцкі цэнтр занятасці" выйграў грант на конкурсе маладзёжных праектаў, які адбываўся ў БДУ. У 2004 годзе ў рамках фестывалю "Моладзь XXI стагоддзя" на гарадскім конкурсе сацыяльных праектаў ён заняў другое месца. На гарадскім конкурсе "Лідэр года — 2004" праект стаў пераможцам у намінацыі "Дзейнасць у сферы занятасці моладзі".

Цэнтр пастаянна пашырае сферу сваёй дзейнасці і запрашае студэнтаў і працадаўцаў да супрацоўніцтва.

*Юлія ПАПОВА, фота аўтара*

***Студэнцкі цэнтр занятасці размяшчаецца па адрасе: прасп. Ф. Скарыны, 4, галоўны корпус БДУ, каб. 205, тэл. 209-52-61.***

## АБ'ЯВЫ

**РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА**
*аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:*

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: мікрабіялогіі, канстытуцыйнага права, гісторыі новага і найноўшага часу, гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу;

ПРАФЕСАРА КАФЕДРЫ фізічнай оптыкі;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: інтэлектуальных сістэм, генетыкі, канстытуцыйнага права, крымінальнага права, паліталогіі, псіхалогіі, гісторыі новага і найноўшага часу, гісторыі Беларусі новага і найноўшага часу, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, тэлебачання і радыёвяшчання, літаратурна-мастацкай крытыкі;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: кібернетыкі, перыядычнага друку, тэлебачання і радыёвяшчання, англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў, педагогікі і праблем развіцця адукацыі, фізічнага выхавання і спорту;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, раманскіх моў, сацыялогіі журналістыкі, гісторыі журналістыкі і літаратуры, тэлебачання і радыёвяшчання.

*Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

**Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5-а, БДУ, упраўленне кадраў, т. 209-54-36.**

**НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЯ ЎСТАНОВА "ІНСТЫТУТ ПРЫКЛАДНЫХ ФІЗІЧНЫХ ПРАБЛЕМ ІМЯ А.Н. СЕЎЧАНКІ" БДУ**
*аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад*

навуковага супрацоўніка па спецыяльнасці 01.04.07 (фізіка кандэнсаванага стану) — 2 чалавекі.

*Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.*

**Дакументы накіроўваць на адрас: г. Мінск, вул. Курчатава, 7, тэл. 212-48-43.**

**УСТАНОВА БДУ "НАЦЫЯНАЛЬНЫ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫ ЦЭНТР ПРЫКЛАДНЫХ ПРАБЛЕМ МАТЭМАТЫКІ І ІНФАРМАТЫКІ"**
*аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантнай пасады*

старшага навуковага супрацоўніка навукова-даследчай лабараторыі праблем бяспекі інфармацыйных тэхналогій.

*Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.*

**Адрас: 220050, г. Мінск, прасп. Ф. Скарыны, 4, пакой 337, ННДЦ прыкладных праблем матэматыкі і інфарматыкі, тэл. 209-50-42.**

## АКЦЫІ

### ПАДАРУНКІ АД САЮЗА ЖАНЧЫН

Калядную акцыю правёў напрыканцы снежня 2004 г. Савет жанчын БДУ. Жанчыны сабралі вопратку і абутак для тых, хто меў патрэбу ў дапамозе і падтрымцы. Яшчэ адным падарункам для ўсіх ад Саюза жанчын стала само святкаванне Каляды. На свяце выступілі дзіцячы калектыў "Літарынка" і народны ансамбль танца "Крыжачок".

*Паводле інфармацыі Саюза жанчын*

### МЫ РАЗАМ

Акцыя "Мы разам" стала ўжо традыцыйнай для камітэта БРСМ БДУ: на працягу года студэнты і супрацоўнікі нашага універсітэта прыносяць разнастайныя цацкі, кніжкі, вопратку і многае іншае, каб пацешыць маленькіх сірот. Напярэдадні Новага года гэтыя рэчы пераўтвараюцца ў падарункі для дзяцей з дзіцячых дамоў — самых удзячных атрымальнікаў.

Вынікам 2004 года стала арганізацыя ў рамках акцыі "Мы разам" 21 снежня святочнага ранішніка ў дзіцячым доме для дашкольнікаў Жодзіна. На свяце выступіў дзіцячы танцавальны калектыў БДУ "Літарынка". Актывісты БРСМ БДУ наладзілі для дзяцей загадзя падрыхтаваныя гульні. Вясёлыя і актыўныя жыхары дзіцячага дома вадзілі карагоды, гучна ляскалі ў далоні "Літарынцы", удзельнічалі ва ўсіх гульнях. Кульмінацыяй свята стала раздача падарункаў. Мы бачылі шчаслівыя твары дзяцей, чыё дзяцінства нельга назваць шчаслівым — значыць, мэта акцыі "Мы разам" дасягнута, і гэта заслуга ўсіх, хто ўзяў у ёй удзел. Дзякуй!

## ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# ВЫЗНАЧАНЫ ЛЕПШЫЯ МАЛАДЗЁЖНЫЯ ПРАЕКТЫ



*На фота: кіраўнік праекта газеты «Обратная Связь» Л. Райскі і рэктар БДУ В.І Стражаў*

Прыемнай падзеяй пачаўся новы год для трох навучэнцаў універсітэта: студэнта журфака Леаніда Райскага, студэнта гістфака Уладзіміра Літвіновіча і студэнта ФМА Уладзіміра Васількова. 3 студзеня ў рэктараце ва ўрачыстай абстаноўцы рэктар В.І Стражаў уручыў ім дыпломы пераможцаў конкурсу грантаў "Найлепшы маладзёжны праект". І месца заняў праект калектыву студэнцкай газеты "Обратная Связь" (кіраўнік праекта Л. Райскі), ІІ месца — праект "Падтрымка маладзёжных ініцыятыў у рамках Каардынацыйнага савета студэнцкіх саветаў БДУ" (кіраўнік праекта У. Літвіновіч), ІІІ месца — праект "Пашырэнне дзейнасці дыскусійнага клуба і выданне студэнцкага альманаха "View" (кіраўнік праекта У. Васількоў). Агульнае фінансаванне ўсіх праектаў складзе каля 4 млн руб.

Мэта конкурсу грантаў "Найлепшы маладзёжны праект" — стварыць умовы для самарэалізацыі моладзі, раскрыцця творчага патэнцыялу, падтрымка і стымуляванне маладзёжных ініцыятыў студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў БДУ. Конкурс грантаў праводзіцца ўжо другі год запар, і колькасць удзельнікаў імкліва расце: у мінулым навучальным годзе заяўкі на ўдзел падалі 9 калектываў саіскальнікаў, у гэтым — ужо 17 калектываў. Прыемна парадавала актыўнасць некаторых факультэтаў: напрыклад, студэнты юрфака падалі 4 заяўкі, а Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій — 3.

*Вольга ЯРАШ*

## ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

# «ФАБРЫКА ЗОРАК» НА ЮРФАКУ

У снежні 2004 г. на юрыдычным факультэце прайшоў традыцыйны конкурс "Фабрыка зорак". Пераможцы Юлія Стоцкая, Святлана Ражкова і інш. атрымалі ад дэканата факультэта грашовыя прэміі. Арганізавалі конкурс дэканат факультэта, старшыня Саюза жанчын факультэта, куратар курса Валянціна Сцяпанаўна Бранавец, каб выявіць таленавітых студэнтаў-першакурснікаў для ўдзелу ў агульнауніверсітэцкім фестывалі "І помніць свет выратаваны", які будзе прысвечаны 60-годдзю Вялікай Перамогі савецкага народа.

Сцэнарый падрыхтавалі студэнты ІІІ курса аддзялення эканамічнага права. Першакурснікі з аддзялення паліталогіі з задавальненнем узялі ўдзел у конкурсе. Кожны "фабрыкант" рыхтаваў сваю праграму, каб напоўніцу выявіць таленты і здольнасці. Канкурсанты танчылі, спявалі эстрадныя песні, чыталі ўласныя вершы і мініяцюры, удзельнічалі і ў конкурсе аратарскага майстэрства. Удзельнікі змаглі не проста выказаць свае думкі, але данесці іх да кожнага ў зале. Яны могуць годна прадстаўляць факультэт на агульнауніверсітэцкім фестывалі.



*Ганна ЦІХАНСКАЯ,*
*Алеся ШУЦЬКО,*
*студэнткі ІІІ курса*

## ШКОЛА ПЕРШАКУРСНІКА

# КАЛІ РЫХТАВАЦЦА ДА СЕСІІ?



Першакурснікі да сесіі ставяцца сур'ёзна: да позняга вечара сядзяць у чытальных залах бібліятэк, чытаюць усю прапанаваную літаратуру. А пасля перажываюць перад дзвярыма ў кабінет, дзе адбываецца экзамен. Для іх першая сесія амаль тое ж, што і ўступныя іспыты. Але — толькі для першакурснікаў. Зрэшты, нават яны хутка разумеюць, што падобныя выпрабаванні ім давядзецца вытрымліваць двойчы на год. Акрамя таго, ад нядаўняга часу ў БДУ пачалі ўводзіць рэйтынгавую сістэму: цяпер студэнт, які добра працаваў на працягу семестра можа атрымаць "аўтамат". Таму самыя старанныя амаль не баяцца сесіі.

Колькі часу трэба, каб падрыхтавацца да экзамена? Мяркуючы па выніках апытання, праведзенага на сайце кафедры перыядычнага друку факультэта журналістыкі (zhurfak.edu.by), пераважная большасць да экзамена пачынае рыхтавацца за 3 дні. Астатнія з тых, хто прагаласаваў (а іх было 70 чалавек), рыхтуюцца за тыдзень ці ў апошнюю ноч, і толькі 1 студэнт на гэтае пытанне адказаў: "З пачатку семестра".

Ёсць і такія, хто зусім не рыхтуецца. Яны жывуць згодна з прынцыпам: "Чым менш рыхтуешся, тым больш халявы". Але гэты закон спрацоўвае далёка не заўсёды. І нядбайным студэнтам часта даводзіцца ісці на пераздачу.

Але сесія прамінула. І кожны студэнт чарговы раз абяцае сабе, што будзе наведваць усе лекцыі, выконваць усе заданні, чытаць неабходныя падручнікі... і амаль ніколі не выконвае абяцанага.

Ці жыве сёння студэнт "ад сесіі да сесіі"? Адназначнага адказу няма. Неаспрэчна адно: кожнаму студэнту даводзіцца працаваць — ці то на працягу семестра, ці то падчас сесіі. Калі — кожны вырашае сам.

*Юлія ПАПОВА*
*Фотаздымкі аўтара*

## СПОРТ

Студэнты нашага універсітэта бліжэйшым часам прымуць удзел у спаборніцтвах па лёгкай атлетыцы. 28 студзеня пачнецца Чэмпіянат Беларусі сярод студэнтаў. 5 лютага — спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы на Кубак горада, 10 лютага — спартакіяда сярод ВНУ.

Як паведамілі "Беларускаму універсітэту" ў спартыўным клубе, цяпер ідзе спартакіяда сярод супрацоўнікаў БДУ. 4—6 лютага адбудуцца фінальныя гульні ў спартыўна-аздараўленчым комплексе "Брыганціна" па плаванні, армрэслінгу, футболе і баскетболе.

## У ВОЛЬНЫ ЧАС

### НА АДПАЧЫНАК У «БРЫГАНЦІНУ»

Студэнты БДУ змогуць адпачыць падчас зімовых вакацый у спартыўна-аздараўленчым комплексе "Брыганціна". Упраўленне выхаваўчай работы з моладдзю разам са студгарадком і пярвічнай прафсаюзнай арганізацыяй студэнтаў арганізуе адпачынак для студэнцкага актыву: 120 студэнтаў прыме "Брыганціна" з 25 па 31 студзеня. Большую частку выдаткаў бярэ на сябе універсітэт і пярвічная прафсаюзная арганізацыя студэнтаў БДУ.

### НЕ ТОЛЬКІ ПРА НАВУЧАННЕ

Напярэдадні Новага года ў ліцэі БДУ адбылася прэс-канферэнцыя, прысвечаная творчаму жыццю навучэнцаў. У вялікай актавай зале сабраліся прадстаўнікі рэдакцый ліцэйскіх газет, вакальнай і тэатральнай студый, творчай групы. Прыйшлі і выпускнікі, якія скончылі ліцэй не толькі ў 2004-м, але і 2—3 гады таму: яны дагэтуль удзельнічаюць у арганізацыі вольнага часу цяперашніх ліцэістаў.

На прэс-канферэнцыі былі прадстаўлены англамоўная газета "View" і рускамоўная "Новая ЛиГа". Ліцэісты, якія займаюцца ў студыі акцёрскага майстэрства пад кіраўніцтвам Андрэя Курэйчыка (выпускніка ліцэя), расказалі пра пастаноўку п'есы М.А. Астроўскага "Навальніца", прэм'ера якой нядаўна адбылася на сцэне актавай залы.

Выступ вакальнай студыі і харэаграфічнага ансамбля "Глорыя", што скончылася выкананнем ліцэйскага гімна, сталі яркім упрыгожаннем гэтай непрацяглай, але карыснай для ўсіх сустрэчы.

*Марыя КАВАЛЁВА*

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

28 студзеня 2005 года

Падпісана да друку 27.01.2005 г.
Ум. друк. арк. 1
Зак. 88. Тыраж 500 экз.

Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 28 чэрвеня 1996 года

Газета надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ" 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Тацццяна КАЗАК

Адрас рэдакцыі: 220050, Мінск, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411
тэлефон 209-53-45
e-mail: Gazeta@bsu.by
www.gazeta.bsu.by